WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 ЛІПЕНЯ 2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 142
(26750)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## БЕЛАРУСЬ НІКОЛІ НЕ МЕЛА НА МЭЦЕ ШКУРНЫЯ ІНТАРЭСЫ, РАЗВІВАЮЧЫ МЫТНЫ САЮЗ І ІДУЧЫ НА ІНТЭГРАЦЫЮ Ў САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЕ

**Беларусь ніколі не мела на мэце шкурныя інтарэсы, развіваючы Мытны саюз Беларусі, Расіі і Казахстана і ідучы на інтэграцыю, у тым ліку ў Саюзнай дзяржаве. Пра гэта ўчора заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з адказным сакратаром Камісіі Мытнага саюза Сяргеем Глазьевым, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, беларускі бок не вінаваты ў тым, што «ў нас у Саюзе Беларусі і Расіі не ўсё, мякка кажучы, атрымліваецца». «У нас і рэсурсаў няма, і не было, каб тармазіць Саюз Беларусі і Расіі. Наогул ён ствараўся, каб паказаць прыклад, пакуль атрымліваецца наадварот. Таму, калі ёсць магчымасць рушыць наперад у нейкіх іншых інтэграцыйных утварэннях, Беларусь ніколі не будзе гэтаму перашкаджаць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым Прэзідэнт адзначыў, што беларускі бок будзе зыходзіць у тым ліку са сваіх нацыянальных інтарэсаў, у той час як іншыя дзяржавы ў аснову ставяць толькі нацыянальныя інтарэсы. «Калі нам адкрыта пачынаюць пры гэтым дэманстраваць, што мы там на лаўцы запасных, мы з такім падыходам не згодныя і наколькі гэта магчыма, каб не тармазіць гэтыя працэсы, змагаемся з гэтым, — адзначыў беларускі лідар. — Калі мы ўбачым, што гэта абсалютна непрымальна для нас, мы будзем шукаць іншыя шляхі».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларускі бок абсалютна не збіраецца тармазіць тыя працэсы, якія пачаліся, аднак, няўхільна выконваючы дасягнутыя дамоўленасці, будзе патрабаваць гэтага ж і ад сваіх партнёраў. Каменціруючы прагучаўшую раней рыторыку, што калі Беларусь не далучыцца да Мытнага саюза, «то мы вас тут нахілім», Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Як жа вы нахіліце, калі мы з Расіяй у гэтым плане вельмі далёка зайшлі і ёсць адпаведныя дагаворы. Як жа можна выбудаваць граніцу паміж Беларуссю і Расіяй? Тады трэба дэнансаваць усе дагаворы, якія ў нас ёсць».

На заканчэнне кіраўнік дзяржавы яшчэ раз адзначыў, што на сённяшні дзень Мытны саюз Беларусі вялікай выгады пакуль не прынёс, таксама як і шкоды. «Мы працуем на тое, знаходзячыся ў рэжыме чакання, каб было лепш», — дадаў беларускі лідар.

У сваю чаргу Сяргей Глазьеў праінфармаваў кіраўніка беларускай дзяржавы аб працэсе фарміравання Мытнага саюза. Паводле яго слоў, у будучым можна чакаць значнага эфекту ад гэтага інтэграцыйнага аб'яднання. Так, чакаецца, што на працягу пяці гадоў прырост ВУП у Мытным саюзе складзе каля 15 працэнтаў. Пры гэтым асаблівую выгаду, паводле яго слоў, атрымаюць прадпрыемствы, якія заняты ў сферы вытворчай кааперацыі. «Вядома, пераходны перыяд праходзіць не гладка, але ў цэлым працэс увайшоў у жорсткую каляіну», — адзначыў Сяргей Глазьеў.

## ЎВОЗ НАЯЎНЫХ БОЛЬШ ЗА 10 ТЫС. НЕАБХОДНА ДЭКЛАРАВАЦЬ

Увоз фізічнымі асобамі наяўных грашовых сродкаў праз мытную граніцу Мытнага саюза на агульную суму, якая перавышае ў эквіваленце $10 тыс., падлягае мытнаму дэкláраванню. Гэта прадугледжана нормамі міжнароднага Дагавора аб парадку перамяшчэння фізічнымі асобамі наяўных грашовых сродкаў і (або) грашовых інструментаў праз мытную граніцу Мытнага саюза, які прымяняецца ў Беларусі з 6 ліпеня 2010 года. Аб гэтым паведамілі **БЕЛТА** ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка, каментуючы новы парадак перамяшчэння фізічнымі асобамі грашовых сродкаў і грашовых інструментаў у Мытным саюзе.

## У НЯДЗЕЛЮ ПАСВЯЖЭЕ



Фота БЕЛТА.

### 23 і 24 ліпеня спякота да плюс 37

**Сёння і ў суботу на тэрыторыі Беларусі захаваецца анамальна гарачае надвор'е. Даволі інтэнсіўна будзе прыпякаць сонца, толькі месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, часам навальніцы, пры навальніцах шквалістае ўзмацненне ветру да 15—20 м/с, паведаміла рэдакцыі начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Людміла ПАРАШЧУК.**

Максімальная тэмпература паветра ўдзень 23 і 24 ліпеня будзе трымацца на ўзроўні 30—34 градусаў вышэй за нуль, а на паўднёвым усходзе — да 35—37. Толькі ў нядзелю да заходніх раёнаў краіны падыдзе актыўны атмасферны фронт, які пачне адціскаць гарачае паветра на ўсход кантынента. Таму на паўднёвым захадзе ўдзень чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у Брэсцкай вобласці моцныя ліўні. Адразу ў заходнім рэгіёне пасвяжэе, калі ўдзень на захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей будзе ўжо 17—22 градусы. На астатняй тэрыторыі краіны захаваецца душнае надвор'е, калі ўначы будзе 15—22, удзень — 25—30, а па ўсходзе — да 33 градусаў. З панядзелка атмасферны фронт пачне гаспадарыць ужо на ўсёй тэрыторыі краіны. Пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах дажджы моцныя з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы 13—20, удзень — ад 17—18 градусаў на захадзе, і да 30—33 на ўсходзе краіны.

Жыхары Гродна ратуюцца ад спёкі на беразе Юбілейнага возера.



## Стаўкі на спажывецкія крэдыты «Беларусбанк» плануе знізіць з 1 жніўня



**Старшыня праўлення ААТ «АСБ Беларусбанк» Надзея ЕРМАКОВА паведаміла на прэс-канферэнцыі, што з 1 жніўня трэба чакаць зніжэння ставак на спажывецкія крэдыты:**

— Што тычыцца крэдытавання насельніцтва, то на 1 ліпеня 2010 года памер гэтага крэдытнага партфеля складаў 13 трыльёнаў рублёў (рост з пачатку года склаў 11 %) або 40 % ад агульнага крэдытнага партфеля банка. Асноўную долю ў крэдытным партфелі — 87 %, або 11,3 трыльёна рублёў — склалі крэдыты, выдзеленыя на будаўніцтва жылля, — як ільготныя, так і на агульных умовах. Сёлета за паўгода на гэтыя мэты накіравана больш за 2,5 трыльёна рублёў, а калі падлічыць з пачатку рэалізацыі жыллёвай праграмы, з 1996 года, то з дапамогай крэдытнай падтрымкі банка пабудавана 253 тысячы кватэр агульнай плошчай амаль 17 мільёнаў квадратных метраў, — сказала Надзея Ермакова. — Што тычыцца ставак па крэдытах для насельніцтва, то мы іх ужо зніжалі — на сёння, напрыклад, на будаўніцтва жылля яны складаюць 15 % гадавых для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і 18 % для тых, хто не мае. З 1 жніўня мы будзем пераглядаць працэнтныя стаўкі на спажывецкія крэдыты і зробім іх трохі меншымі, а калі казаць пра жыллёвыя, то 15 % — гэта нармальны працэнт, сёння ўжо, напэўна, зніжаць нельга...

З 26 ліпеня «Беларусбанк» таксама знізіць стаўкі і па крэдытах для юрыдычных асобаў: па наноў выдаваемых крэдытах стаўка ў «Беларусбанку» будзе ў памеры стаўкі рэфінансавання плюс 3-5 %, а па ўжо выдадзеных крэдытах — стаўка рэфінансавання плюс 5-7 %.

Але адначасова «Беларусбанк» будзе зніжаць і стаўкі па ўкладах насельніцтва.

— Нельга разаграваць дарагімі грашыма эканоміку, калі мы бачым, што грошы на міжбанкаўскім рынку можна купіць па цане да 10 %. Стаўка рэфінансавання сёння складае 11,5 % і мы бачым, што яна ў найбліжэйшай будучыні будзе яшчэ зніжацца, для гэтага ёсць перадумовы ў развіцці эканомікі. Зразумела, насельніцтву хочацца атрымаць крэдыт па нізкай стаўцы, а ўклады трымаць па высокай, але так нельга, бо будзе разбалансіроўка эканомікі і некаму давядзецца браць на сябе выдаткі, — лічыць Надзея Ермакова. — У залежнасці ад тэрмінаў захавання сёння стаўкі па ўкладах насельніцтва вар'іруюцца ад 14-15 % па самых кароткіх тэрмінах, ад 15 дзён, да 18 % па самых працяглых, на 3 гады. З улікам таго, што прыйшоў той час, калі ў краіне павінны зніжацца стаўкі па крэдытах, працэнтныя стаўкі павінны зніжацца і па рэсурсах, якія банкі прыцягваюць, у тым ліку і па сродках насельніцтва. Таму мы з 1 жніўня ссунем стаўкі па дэпазітах у бок зніжэння, я пакуль не буду казаць на колькі, бо рашэнне праўлення пакуль яшчэ не прынятае, але недзе на 1-2 % па розных відах укладаў, — паведаміла Надзея Андрэеўна.

СТАР. 2

## Ну і ну!

### СПАЎ НА МАТРАЦЫ... ПАСЯРОД МОРА!

**Мінчаніна, які спаў на надзіманым матрацы, знайшлі выратавальнікі, робячы ўначы планавы аб'езд Мінскага мора на катары.**

Як паведамілі ў Мінскай гарадской арганізацыі АСВОД, дзяжурная змена выратавальнай станцыі «Заслаўе-1», ажыццяўляючы на катары планавы аб'езд пасля заканчэння дыскатэкі на востраве Мінскага мора, заўважыла на вадзе мужчыну. Ён плыў на напалову здзьмутым матрацы і спаў. Ды так моцна, што будзіць яго давялося пры дапамозе мегафона. Адважным мараходам аказаўся мінчанін 1989 года нараджэння, жыхар Ленінскага раёна. Як высветлілася ў ходзе гутаркі, на момант адпраўкі ў вояж ён быў не зусім цвярозы... З 1 студзеня па 21 ліпеня 2010 года на сталічных вадаёмах выратавана 56 чалавек, у тым ліку сем дзяцей.

**Аляксей ІВАНЮШКА, «Мінск-Навіны».**

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК
ТРАДИЦИИ НАДЕЖНОСТЬ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

ОАО «БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК»
г. Минск, ул. Мясникова, 32

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2010 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.07.2010 г. | на 01.07.2009 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 65465,7 | 68857,9 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 46225,2 | 73172,6 |
| 4 | Ценные бумаги | 1103 | 213439,5 | 30424,3 |
| | для торговли | 11031 | - | - |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 25147,3 | - |
| | в наличии для продажи | 11033 | 188292,2 | 30424,3 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 378553,3 | 293750,9 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 1507184,7 | 1261618,2 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 5871,6 | 5095,3 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 84861,0 | 77253,7 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 20479,8 | 15818,9 |
| 10 | ИТОГО АКТИВЫ | 110 | 2322080,8 | 1825991,8 |
| 11 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 659,7 | 504,7 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 468950,4 | 414252,1 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 1046993,7 | 912331,6 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 2618,0 | 5887,0 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 31765,7 | 34237,3 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 1550987,5 | 1367212,7 |
| 18 | КАПИТАЛ | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 605017,0 | 327483,0 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 30584,0 | 20879,1 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 77357,4 | 55997,7 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 58134,9 | 54419,3 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 771093,3 | 458779,1 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 2322080,8 | 1825991,8 |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 907248,2 | 564525,2 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 633849,0 | 408240,9 |

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2010 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.07.2010 г. | на 01.07.2009 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 138499,0 | 92411,3 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 44870,3 | 48250,8 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 93628,7 | 44160,5 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 32199,3 | 29391,7 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 4533,4 | 3532,7 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 27665,9 | 25859,0 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 10972,6 | 16245,6 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 70,6 | 35,4 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | 205,0 | 1175,5 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 31172,0 | 7051,9 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 8608,6 | 11871,3 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 61702,8 | 47661,7 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 10608,2 | 12333,7 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 5303,4 | 8343,1 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 32365,0 | 23956,9 |

И.о. Председателя Правления — О.Г. Прохорчик

Главный бухгалтер — З.С. Кушнерова

Лицензия НБРБ на осуществление банковской деятельности № 6 от 27.10.2006. УНП 100010078.

## Акцэнт

### НЕ ЎЦЯКАЦЬ АД КАМЕР І МІКРАФОНАЎ!

Заклікаў чыноўнікаў міністр інфармацыі Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ

«У параўнанні са сваімі заходнімі калегамі нашы міністры менш публічныя. Такія чыноўныя традыцыі ў многіх краінах СНД», — сказаў Алег Праляскоўскі.

Адказваючы на пытанне аб мэтазгоднасці размяшчэння ў інтэрнэце персанальных старонак беларускіх чыноўнікаў па аналогіі з замежнымі палітыкамі, міністр адзначыў, што не лічыць мэтазгоднымі іх стасункі ў прыватным парадку з вэб-карыстальнікамі. «У любой краіне выказванне высокапастаўленага чыноўніка — фактычна афіцыйная пазіцыя адпаведнага ведамства. Тым больш што ў сетцы вельмі актыўна выступаюць іншыя прадстаўнікі беларускай прэсы, навукі, культуры», — адзначыў міністр.

Сайты газет павінны стаць дыскусійнай пляцоўкай у выглядзе розных форумаў і блогаў, лічыць Алег Праляскоўскі.

Нагадаўшы аб ініцыятыве Мінінфарма і Беларускага саюза журналістаў па стварэнні ў гэтым годзе адзінага нацыянальнага інтэрнэт-партала СМІ, міністр падкрэсліў, што сайты газет павінны істотна адрозніваца ад друкаваных версій. «Практычна ўсе раёнкі прадстаўлены ўжо ў інтэрнэце. Пры гэтым даступны ўсім электронны варыянт павінен змяшчаць, у першую чаргу, аператыўныя звесткі, быць дыскусійнай пляцоўкай у выглядзе розных форумаў і блогаў, а друкаваны — уключаць у асноўным аналітычныя публікацыі», — сказаў ён.

Алег Праляскоўскі асабліва звярнуў увагу на дэфіцыт у СМІ праблемных, крытычных матэрыялаў, агульнаадукацыйных і асветных праграм і публікацый. Газетам, на яго думку, не хапае сур'ёзных і творча адораных журналістаў, здольных не толькі асвятляць надзённыя праблемы, але і прапаноўваць шляхі іх вырашэння.

«Задача пераходу на самаакупнасць не павінна з'яўляцца самамэтай. Цяпер акцэнт трэба рабіць на інфармацыйна-ідэалагічны складальнік. Галоўным рэдактарам неабходна праводзіць больш гібкую рэдакцыйна-выдавецкую палітыку, дабівацца жанравай разнастайнасці», — падкрэсліў Алег Праляскоўскі.

На яго думку, эфектыўнасць СМІ на месцах істотна павысіцца ў выпадку стварэння міжраённых медыяхолдынгаў.

**БЕЛТА.**

## Эксклюзіў

## «САЦЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА ВЫХОДЗІЦЬ НА НОВЫ ЯКАСНЫ ЎЗРОВЕНЬ»

**УЗРОВЕНЬ уласнага жыцця, безумоўна, у першую чаргу залежыць ад асабістых намаганняў, і ў тым ліку — ад магчымасці зарабіць грошы. І ўсё ж не сакрэт, што з прычыны ўзросту ці стану здароўя зарабляць можа далёка не кожны. А адсюль — і традыцыйна няпростыя пытанні. Якія віды сацыяльных паслуг стануць развівацца ў Беларусі, наколькі паспяхова ідзе стварэнне безбар'ернага асяродку, ці павялічыцца колькасць пуцёвак у санаторыі для ветэранаў і інвалідаў, а таксама ці «запрацавалі» новыя ўмовы аказання адраснай сацыяльнай дапамогі — пра ўсё гэта гутарка карэспандэнта «Звязды» з міністрам працы і сацыяльнай абароны Беларусі Марыянай Акіндзінаўнай ШЧОТКІНАЙ.**



***— Як вядома, ужо даволі працяглы час у Беларусі існуе свая мадэль дапамогі людзям, якія апынуліся ў няпростай жыццёвай сітуацыі, прычым асноўная стаўка тут робіцца на тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Якія паслугі цэнтраў карыстаюцца найбольшай папулярнасцю сёння і, на ваш погляд, якія новыя напрамкі будуць запатрабаваныя заўтра?***

— Наша мадэль з'явілася нездарма. Найбольш эканамічнай і адначасова найбольш набліжанай да рэальных патрэбаў людзей аказваецца прапанаванне ім сацыяльных, бытавых, кансультацыйных і псіхалагічных паслуг менавіта праз тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Сетка цэнтраў пачала стварацца яшчэ ў 1999 годзе, і сёння іх 154 — гэтыя ўстановы працуюць у кожным адміністрацыйным раёне Беларусі.

Прычым практыка паказвае, што ў першую чаргу запатрабавана, і асабліва ў сельскай мясцовасці, сацыяльнае абслугоўванне дома — маецца на ўвазе набыццё і дастаўка прадуктаў харчавання і тавараў першай неабходнасці, дастаўка вады, уборка памяшканняў, суправаджэнне ў паліклініку ці бальніцу, назіранне за станам здароўя, дапамога ў правядзенні жыллёва-камунальных разлікаў, у нарыхтоўцы агародніны на зіму, у распальванні печак, у атрыманні талонаў да ўрача, у афармленні дакументаў і гэтак далей. І, дарэчы, сёння паслугі дома атрымліваюць 82,7 тысячы нашых пенсіянераў і інвалідаў.

СТАР. 2

## На жніво — усёй грамадой

**САМЫ гарачы час — на палетках. Гэта і літаральна, і вобразна. Калі на тэрмометры за 30, а палеглае ад бурана калоссе гатова аддаць збожжа — напал працы самы высокі. Да жніва прыступілі ва ўсіх абласцях, і ў кожным рэгіёне яно сёлета па-свойму складанае. Напрыклад у цэнтральнай зоне, на Міншчыне, з-за хуткага выспявання жніво пачалі на тыдзень раней, чым летась. Больш за 600 тысяч гектараў збожжавых, зернебабовых, азімага рапсу — у цэнтры найвышэйшай увагі не толькі вяскоўцаў, але і калектываў шматлікіх прадпрыемстваў і ўстаноў, адкуль паступае дапамога.**

Больш за 52 тысячы гектараў азімых і яравых культур — такая плошча сёлетняга жніва ў Салігорскім раёне. З-за моцных ліўняў колас палёг на кожным пятым гектары. Цяжка падымаць такое калоссе з зямлі, але камбайны ў гаспадарках абсталяваныя такім чынам, што страты будуць зведзеныя да мінімуму. Да таго ж парк збожжаўборачнай тэхнікі папоўніўся гэтым летам 20-цю новымі гомельскімі камбайнамі. На дапамогу механізатарам прыйшло 145 працаўнікоў падшэфных прадпрыемстваў і ўстаноў — усе яны маюць спецыяльнасці, якія найбольш неабходныя ў гэтыя гарачыя дні. Для занятых у полі падвозяць пітную ваду, арганізавана двухразовае харчаванне.

Завяршыць жніво ў раёне разлічваюць за 20 дзён.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.
Фота аўтара.**





Сяргей ШКРАБА і яго сын Павел працуюць у СВК «Краснадворцы». Перадавому сямейнаму экіпажу механізатараў днямі былі ўручаны лісты з падзякай ад Салігорскага райвыканкама і падарункі.



Жніво на палетках СВК «Краснадворцы».



Тэхніка Віталя ПЛЕХАНА камандзіраваў на жніво ў СВК «Гарняк» калектыў Інстытута горнай аўтаматыкі.



Маёр Аляксандр ЖАРСКІ і прапаршчык Сяргей ПЕТРУШЭЎСКІ з салігорскай пажарна-аварыйнай выратавальнай часці № 1 таксама дапамагаюць вяскоўцам на жніве: іх камбайнавы экіпаж не адстае ад лепшых.

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.07.2010 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 990,00 | 1 чэшская крона | 152,59 |
| ▼ 1 еўра | 3 825,71 | 1 польскі злоты | 935,90 |
| 1 латвійскі лат | 5 409,81 | ▼ 1 расійскі рубель | 97,97 |
| 1 літоўскі літ | 1 111,28 | 1 украінская грыўня | 378,72 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 30,5205 |
| 10 UAH | 38,6605 |
| 1000 BYR | 10,2212 |
| EUR | 38,9503 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## УКРАІНСКАЕ ВОЙСКА СКАРОЦЯЦЬ НА 20 %



**Міністэрства абароны Украіны заклала ў канцэпцыю рэфармавання ўзброеных сілаў скарачэнне колькасці асабовага складу арміі на 15—20 % да 2015 года. Сёння колькасць украінскага войска — прыкладна 200 тысяч чалавек.**

Акрамя таго, да гэтага тэрміну Мінабароны плануе пазбавіцца ад «залішніх» узбраення, ваеннай тэхнікі і аб'ектаў інфраструктуры. Пры гэтым да 2012 года ўкраінцы хочуць «стабілізаваць» сітуацыю ў войсках, гэта значыць спыніць іх дэградацыю і ўжо затым пачаць паступова іх развіваць. Акрамя таго, у дакуменце сказана, што УС Украіны захаваюць трохвідавую структуру (ВПС, ВМС і сухапутныя войскі).

Плануецца таксама ўвесці новыя прынцыпы функцыянавання баявых вайсковых часцей. У мірны час асобныя палкі і брыгады будуць пераведзены ў рэжым працы баз мабілізацыйнага разгортвання. На правядзенне рэформаў міністэрства абароны папрасіла фінансаванне на ўзроўні прынамсі 1 % ад ВУП у год, што, па меркаванні вайскоўцаў, адпавядае еўрапейскаму ўзроўню.

## ПЕНСІЙНЫ ФОНД: АФІЦЫЙНАЯ ЗАРПЛАТА 17 % РАСІЯН — МЕНШ ЗА 1000 РУБЛЁЎ



**Пенсійны фонд Расіі (ПФР) б'е трывогу — афіцыйную заработную плату меней за тысячу рублёў у месяц (каля 32 долараў) атрымлівае каля 17 % працуючых грамадзян. Гэты факт негатыўна адаб'ецца на пенсійным забеспячэнні насельніцтва, рост якога можа адбыцца толькі ўслед за павелічэннем фонду зарплаты, піша «Незалежная газета».**

На думку спецыялістаў, гэта сведчыць пра тое, што заработная плата выплачваецца не заўсёды ў белую. Тым часам Расстат адзначае, што колькасць працуючых грамадзян у краіне складае каля 71 млн чалавек, так што 17 % ад іх — істотная лічба.

Эксперты адзначаюць, што паказчык шэрых зарплат у расійскай эканоміцы можа складаць ад 40 да 60 %. За час крызісу гэтыя лічбы павялічыліся на 10—20 %.

## БРЫТАНСКІ ПРЭМ'ЕР АБУРЫЎ СУАЙЧЫННІКАЎ, ПАЧАЎШЫ ПРЫНІЖАЦЦА ПЕРАД ЗША



**Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Дэвід Кэмеран абурыў сваіх суайчыннікаў, заявіўшы, быццам Вялікабрытанія ў 1940 годзе была «малодшым партнёрам» Амерыкі ў барацьбе супраць нацызму, піша газета The Daily Mail.**

Кэмеран дазволіў сабе гэта выказванне падчас свайго першага візіту ў ЗША ў якасці прэм'ер-міністра падчас інтэрв'ю тэлеканалу Sky News, гаворыцца ў артыкуле. «Думаю, у жыцці заўсёды важна называць рэчы сваімі імёнамі, і дакладна тое, што мы вельмі эфектыўны партнёр Злучаных Штатаў, але мы малодшы партнёр, — сказаў ён. — Мы былі малодшым партнёрам у 1940 годзе, калі змагаліся з нацыстамі».

Злучаныя Штаты, якія да таго аказвалі Брытаніі толькі матэрыяльную дапамогу, уступілі ў вайну толькі ў снежні 1941 года, пасля бамбёжкі японцамі Пэрл-Харбара. Усяго брытанцы страцілі на вайне 449 800 чалавек, у той час як амерыканцы — 418 500.

Гісторык Эндру Робертс, аўтар працы па гісторыі Другой сусветнай вайны «Бура вайны», сказаў: «Прэм'ер-міністр не мае рацыі. У першыя гады вайны ў Брытаніі было войска з 2,4 мільёна чалавек, у той час як у амерыканцаў было 240 тысяч — у дзесяць разоў менш».

«У 1940 годзе была матэрыяльная дапамога ад Амерыкі, але не ваенныя дзеянні супраць фашыстаў. Брытанія была вядучым партнёрам у сэнсе стратэгіі мінімум да 1943 года», — заявіў гісторык. Адстаўныя вайскоўцы аднадушна асудзілі такое выказванне прэм'ер-міністра, знайшоўшы яго зневажальным для нацыі, асабліва для ветэранаў Другой сусветнай вайны.

## АЯТАЛА ХАМЕНІ ЗАКЛІКАЎ МУСУЛЬМАН НА ВАЙНУ З АМЕРЫКАНСКІМ ТЭРАРЫЗМАМ

**Вярхоўны лідар Ірана Аятала Алі Хамені ў тэлевізійным звароце да народа абвінаваціў ЗША і Вялікабрытанію ў дачыненні да тэракта ў Захедане 15 ліпеня, у выніку якога загінулі, па апошніх звестках, 28 чалавек, піша The Daily Telegraph.**

Хамені абвясціў палітыку ЗША і Вялікабрытаніі галоўным чыннікам росту «сляпога і вар'яцкага тэрарызму» на Усходзе і заклікаў усіх мусульман супрацьстаяць тэрору.

Тэрарыстаў-смяротнікаў, якія падарвалі 15 ліпеня мячэць у Захедане на паўднёвым усходзе Ірана, Аятала назваў «аблуднымі фанатыкамі-вахабітамі, якія карысталіся падтрымкай замежных разведак». Адказнасць за тэракт узяла на сябе групоўка «Джандала», якая абвяшчае сваёй мэтай барацьбу за правы сунітаў у пераважна шыіцкім Іране. Іранскія ўлады раней неаднаразова абвінавачвалі «Джандалу» ў атрыманні дапамогі з-за мяжы, у прыватнасці, ад амерыканскіх войскаў, якія стаяць у Афганістане і Пакістане.

## ТЭЛЕФОН І КАМП'ЮТАР ПАГРАЖАЮЦЬ ВАШАМУ АДПАЧЫНКУ!

**Офісны работнік, стомлены працай ва ўмовах пастаяннага стрэсу, не адчувае сябе адпачылым пасля водпуску. Псіхолагі брытанскага Institute of Leadership and Management, правялі даследаванне з удзелам 2500 менеджараў і прыйшлі да высновы, што пасля вяртання на працу людзі адчуваюць яшчэ большы стрэс, чым перад водпускам. Пра гэта вучоным заявілі 40 % апытаных менеджараў, паведамляе брытанскі таблоід The Daily Mail.**

Як прызналіся шматлікія рэспандэнты, думкі аб працы не адпускаюць іх і на адпачынку, у выніку замест таго, каб атрымліваць асалоду ад вольнага часу і мець стасункі з сям'ёй, яны ўвесь час правяраюць працоўную пошту і адказваюць на тэлефонныя званкі з офіса. У такіх паводзінах людзей псіхолагі вінавацяць сучасныя тэхналогіі — мабільную сувязь і інтэрнэт, якія робяць магчымай аддаленую працу.

## АСОБНЫЯ ЎЛАДАЛЬНІКІ ЭЛІТНАГА ЖЫЛЛЯ АТРЫМАЮЦЬ ІЛЬГОТЫ ПА ЖКГ

**Спецыяльны праект пастановы рыхтуецца ў беларускім урадзе. Пра гэта паведаміў намеснік міністра ЖКГ Мікалай ЛІПЕНЬ.**

Па інфармацыі спадара Ліпеня, у гэтай пастанове будуць прапісаны катэгорыі грамадзян-уладальнікаў элітных катэджаў і дамоў вялікай плошчы, якія змогуць плаціць за паслугі ЖКГ па звычайных тарыфах, а не па сабекошце. Як адзначыў Мікалай Ліпень, абмяркоўваецца не сам падыход да вызначэння дамоў павышанай камфортнасці, а менавіта катэгорыі грамадзян-ільготнікаў.

З 1-га чэрвеня ў Беларусі дзейнічае пастанова № 639. Згодна з ёй уласнікі катэджаў і дамоў павышанай камфортнасці, агульная плошча якіх перавышае 200 кв. м, павінны аплачваць 100-працэнтны кошт паслуг ЖКГ. Аналагічнае рашэнне прынята для грамадзян і арганізацый, ва ўласнасці якіх маюцца жыллёвыя памяшканні, у якіх ніхто не жыве.

На пытанне, ці будуць павышацца тарыфы на паслугі ЖКГ для астатніх катэгорый насельніцтва ў бліжэйшы час, спадар Ліпень адказаў, што такое пытанне не разглядаецца і ніякіх рашэнняў у сувязі з гэтым не прымалася.

Ён дадаў, што ў выпадку павышэння коштаў на энерганосьбіты міністэрства будзе прадпрымаць дадатковыя меры па зніжэнні выдаткаў на аказанне паслугаў ЖКГ і распрацоўваць новыя віды платных паслугаў для насельніцтва.

— Пытанні тарыфаў звязаныя з даходамі насельніцтва. З гэтага і варта зыходзіць у першую чаргу, — гаворыць спадар Ліпень. — Таму што можа атрымацца такая сітуацыя, што тарыфы мы ўстановім, а пасля насельніцтва не зможа аплачваць тыя паслугі, якія сёння ім аказваюць. Мы да гэтага не імкнёмся. Па канцэпцыі развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі мы павінны забяспечыць поўнае пакрыццё выдаткаў на паслугі ЖКГ да 2015 года. Сёння насельніцтва аплачвае менш за 30 працэнтаў ад сабекошту. Розніца, канешне ж, кампенсуецца з бюджэту. Да 2015 года 100 працэнтаў аплаты паслуг ЖКГ не будзе, я думаю.

**Настасся ЗАНЬКО.**

## Стаўкі на спажывецкія крэдыты «Беларусбанк» плануе знізіць з 1 жніўня

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры гэтым яна заўважыла, што банк ужо зніжаў працэнтную стаўку два разы, і адтоку ўкладаў не адбылося, наадварот, «чатыры-пяць мільярдаў штодзённа ідзе прырост укладаў у беларускіх рублях, а ў валюце — тут усё залежыць ад курсу».

З пачатку гэтага года аб'ём укладаў насельніцтва ў «Беларусбанку» вырас на 2 трыльёны рублёў, або на 18 % і такім чынам прыцягнутыя банкам ад насельніцтва сродкі склалі 12,3 трыльёна рублёў. Пры гэтым «Беларусбанк» акумулюе 57 % ад усіх укладаў насельніцтва, размешчаных на рахунках банкаўскай сістэмы краіны.

Старшыня праўлення «Беларусбанка» выказала сваё меркаванне наконт нядаўняй ініцыятывы па павелічэнні долі безнаяўных разлікаў праз ліквідацыю банкаматаў у крамах.

— Банкаматы з крамаў знімаць, напэўна, няма сэнсу. Не трэба адміністрацыйным шляхам прымушаць чалавека ісці ў касу і расплачвацца карткай. Трэба іншым шляхам ісці да народа, расказваць людзям, і ў першую чаргу — самім прадаўцам, вучыць іх працаваць з карткай, расказваць, які вынік гэта ім дае. Знімаць банкаматы — гэта самы лёгкі варыянт, — сказала Надзея Ермакова і дадала, што існуе план па аб'яднанні банкаматаў ад розных банкаў у адзіную сетку, але гэтаму пакуль замінаюць тэхнічныя цяжкасці.

Старшыня праўлення «Беларусбанка» адзначыла, што ўвогуле банк па выніках першага паўгоддзя 2010 года пацвярджае свае лідзіруючыя пазіцыі ў краіне і забяспечвае становучую дынаміку развіцця: прыбытак за першыя паўгода павялічыўся на 38 % у параўнанні з аналагічным перыядам 2009 года і склаў 200 мільярдаў рублёў, рэнтабельнасць дзейнасці скала 7,6 %, рэнтабельнасць капіталу — 5,9 %.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# «...НА НОВЫ ЯКАСНЫ ЎЗРОВЕНЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Разам з тым сацыяльнае абслугоўванне дома — напрамак у тэрытарыяльных цэнтрах далёка не адзіны. Значным попытам карыстаюцца аддзяленні кругласутачнага знаходжання для пенсіянераў і інвалідаў. Тут непрацаздольныя грамадзяне, якія з прычыны ўзросту ці стану здароўя не могуць працяглы час знаходзіцца дома, маюць магчымасць пажыць тэрмінам да 6 месяцаў у год і адначасова — атрымаць догляд, харчаванне, медыцынскія кансультацыі і рэабілітацыйныя паслугі. Цяпер у Беларусі ўжо налічваецца 51 такое аддзяленне.

Таксама перспектыўны і вельмі важны напрамак развіцця сацыяльнага абслугоўвання — дапамога маладым інвалідам у аднаўленні здольнасцяў да самаабслугоўвання, развіццё іх цікавасці да працоўнай дзейнасці, арганізацыя заняткаў па інтарэсах, адпачынку. З гэтай мэтай у цэнтрах ствараюцца аддзяленні дзённага знаходжання. На сёння працуюць 123 такія аддзяленні, у складзе іх дзейнічаюць 620 гурткоў і клубаў па інтарэсах, 82 рэабілітацыйна-працоўныя майстэрні. У цэлым жа аддзяленні наведваюць каля 3 тысяч інвалідаў. Аднак пры гэтым сёння стаіць задача стварыць тут па-сапраўднаму вартую базу для правядзення працоўнай рэабілітацыі — на жаль, пакуль многія рэабілітацыйна-працоўныя майстэрні яшчэ не зусім адпавядаюць сучасным патрабаванням. Апроч таго, неабходна вырашыць пытанні рэалізацыі вырабаў, што робяцца ў майстэрнях, а таксама павялічыць плошчы аддзяленняў дзённага знаходжання — для арганізацыі дзейнасці новых гурткоў, студый і клубаў па інтарэсах.

Пры гэтым адзначу, што прыярытэтамі развіцця сістэмы сацыяльнага абслугоўвання з'яўляецца працяг стварэння аддзяленняў кругласутачнага і дзённага знаходжання, а таксама, зноў жа, рэабілітацыйна-працоўных майстэрняў — з адпаведным тэхнічным узбраеннем і метадалагічным забеспячэннем. А плюс да таго для аказання паслуг жыхарам вёсак неабходна развіваць дзейнасць гаспадарчых брыгад, брыгад сацыяльнага абслугоўвання на мабільнай аснове, пашыраць валанцёрскі рух.

***— Не сакрэт, што віды сацыяльных паслуг у асобных рэгіёнах могуць адрозніваццa. Ці не варта ў такім выпадку вызначыць якія-небудзь адзіныя для ўсёй краіны стандарты?***

— Па сутнасці такі стандарт ужо існуе — маецца на ўвазе Пералік бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг, якія прадастаўляюцца сацыяльнымі ўстановамі ў адпаведнасці з іх профілем. Што ж да іншых «агульных рамак», то мы не лічым іх мэтазгоднымі. Урэшце ў кожнага рэгіёна ёсць свае сацыяльныя, дэмаграфічныя і эканамічныя асаблівасці, і менавіта гэтыя асаблівасці павінны вызначаць «наборы» паслуг асобных тэрытарыяльных цэнтраў.

***— Асобная тэма — даступнасць сацыяльных паслуг. Ці будуць яны «набліжацца» да жыхароў невялікіх і аддаленых вёсак?***

— На сёння гэта — сапраўды адна з галоўных задач. І шляхоў яе вырашэння некалькі. Каб наблізіцца да жыхароў аддаленых вёсак, за межамі райцэнтраў ідзе стварэнне сацыяльных пунктаў — на сёння ўжо працуе 564 падобныя філіялы тэрытарыяльных цэнтраў, прычым у 354 сацыяльных пунктах практыкуецца работа з выездамі.

Апроч таго, ёсць і іншыя варыянты — стварэнне тых жа гаспадарчых брыгад і брыгад сацыяльнага абслугоўвання на мабільнай аснове. Адно, што ўсё ж варта заўважыць: неабходна надаваць большую ўвагу забеспячэнню падобных брыгад сучаснай тэхнікай і інструментамі.

***— У краіне існуе традыцыйны і да таго ж вялікі попыт на санаторна-курортнае лячэнне ветэранаў і інвалідаў. У сувязі з гэтым, як будуць развівацца айчынныя спецыялізаваныя здраўніцы?***

— Для пачатку варта заўважыць, што ў нас ёсць чатыры спецыялізаваныя санаторыі для ветэранаў і інвалідаў з рознымі профілямі захворванняў, прычым усе здраўніцы працуюць са 100-працэнтнай загрузкай — штогод іх наведвае каля 11,5 тысячы чалавек. І невыпадкова. Даводзіцца канстатаваць, што ва ўсіх санаторыях створаныя ўмовы для камфортнага пражывання, тут распрацаваны адмысловыя, адаптаваны да асобаў пажылога ўзросту, методыкі лячэння. Да таго ж усе здраўніцы маюць сучаснае медыцынскае абсталяванне і дыягнастычную апаратуру, могуць аказваць самыя розныя паслугі — у тым ліку гаворка ідзе пра разнастайныя ванны і гразевыя працэдуры з выкарыстаннем сапрапелевых гразяў. А той жа санаторый «Бярэзіна» мае ўласную свідравіну мінеральнай вады — па сваім складзе яна вельмі блізкія да трускавецкай і ждановіцкай.

Пры гэтым умовы для аздараўлення працягваюць паляпшацца. Летась былі закончаныя работы па рэканструкцыі водалячэбнага аддзялення, залы лячэбнай фізкультуры, пакоя псіхалагічнай разгрузкі, актавай, танцавальнай і гульнявой залы ў санаторыі «Ясельда» ў Пінскім раёне, а зараз ідзе рэканструкцыя лячэбных карпусоў санаторыяў «Бярэзіна» ў Барысаве і «Вяжуці» на Маладзечаншчыне. І адначасова вядзецца будаўніцтва спальнага корпуса санаторыя «Белая Вежа» ў Камянецкім раёне на 108 месцаў. Увод у эксплуатацыю першай часткі новага корпуса на 54 месцы запланаваны на гэты год, прычым зразумела: у выніку нашы пенсіянеры і інваліды змогуць атрымаць дадатковую колькасць пуцёвак.

Дарэчы, варта заўважыць, што для даступнасці здраўніц для пажылых людзей і інвалідаў наша міністэрства працуе над тым, каб пуцёўкі былі больш таннымі. Сёння поўны кошт пуцёўкі на санаторна-курортнае лячэнне з пражываннем у двухмесным нумары тэрмінам на 18 дзён вагаецца ад 784.990 да 1.060.040 рублёў. Прычым ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і непрацуючыя інваліды I-II груп могуць наведваць нашы санаторыі бясплатна, а ветэраны працы і інваліды III групы плацяць ад 15 да 20 працэнтаў ад поўнага кошту — у залежнасці ад свайго даходу і сезона.

***— Безбар'ерны асяродак — своеасаблівы паказчык цывілізаванасці любой краіны. Што ў гэтым плане ўдалося і наадварот, не ўдалося зрабіць за апошнія гады ў Беларусі?***

— Можна пагадзіцца, што гэтая тэма — надзвычай актуальная. Варта нагадаць: для забеспячэння бесперашкоднага доступу інвалідаў да аб'ектаў сацыяльнай і іншай інфраструктуры, для паляпшэння якасці іх жыцця з 2007 года ў Беларусі дзейнічае Дзяржаўная праграма па стварэнні безбар'ернага асяродку для фізічна аслабленых асобаў, якая разлічаная да 2010 года. І зрабіць у рамках праграмы ўдалося многае.

Падчас дзеяння праграмы распрацавана 17 спецыяльных стандартаў (13 з іх пачалі дзейнічаць летась, а яшчэ 4 будуць уведзеныя сёлета), рэгіёны набылі і паставілі «на лінію» 1590 аўтобусаў, тралейбусаў і трамваяў з нізкай падлогай, а наша чыгунка ўжо мае 15 вагонаў, прызначаных для перавозкі інвалідаў-калясачнікаў. Ёсць і іншыя станоўчыя моманты — скажам, выдзяленне месцаў для бясплатнай стаянкі аўтатранспарту інвалідаў, рэканструкцыя бар'ераў на дарогах і пешаходных дарожках, устаноўка поручняў і пандусаў у жылых дамах.

Увогуле за час рэалізацыі праграмы работы па стварэнні безбар'ернага асяродку ў нашай краіне выкананы на 7507 аб'ектах сацыяльнай інфраструктуры. Як вынік, удзельная вага аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры, прыстасаваных для доступу інвалідаў і іншых катэгорый фізічна аслабленых асобаў, у сярэднім па Беларусі павялічылася з 19,9 працэнта ў 2006 годзе да 35 працэнтаў летась. І ўсё ж гэтага яшчэ недастаткова. Казаць, што ўдалося зняць усе перашкоды для перасоўвання фізічна аслабленых асобаў, пакуль не выпадае.

Асаблівасць стварэння безбар'ернага асяродку ў тым, што тут нельга зрабіць штосьці адно, работы павінны весціся на тэрыторыі ўсяго жылога масіву — пандусы каля крамы не маюць аніякага сэнсу, калі інвалід не можа пераадолець дарогу да той жа крамы ці нават выйсці са свайго дома. У гэтым плане найбольшыя складанасці ўзнікаюць са старымі дамамі, сацыяльнымі аб'ектамі і інфраструктурай, прычым на вырашэнне праблем тут спатрэбяцца пэўны час і фінансавыя рэсурсы. Аднак нельга пакідаць па-за ўвагай і новабудоўлі — за выкананнем будаўнічых правілаў і нормаў неабходны жорсткі кантроль. Словам, спраў яшчэ вельмі шмат. І зрабіць наступныя крокі плануецца ў рамках новай Дзяржаўнай праграмы па стварэнні безбар'ернага асяродку для фізічна аслабленых асобаў на 2011—2015 гады — распрацоўка праекта гэтай праграмы вядзецца зараз.

***— І апошняе. Вось ужо паўгода ў краіне дзейнічаюць новыя ўмовы аказання адраснай сацыяльнай дапамогі. Якія тут першыя вынікі?***

— Крыху лічбаў. У цэлым за першую палову года адрасная сацыяльная дапамога была прызначана 106,1 тысячы чалавек, і больш за 60 працэнтаў з іх былі членамі шматдзетных ці няпоўных сем'яў. Пры гэтым сярэдні памер штомесячных адрасных выплат склаў 49,7 тысчы, а аднаразовых адрасных выплат — 226,2 тысячы рублёў на чалавека ў месяц.

У выніку можна заўважыць, што адрасная сацыяльная дапамога аказалася запатрабаванай. І ў тым ліку — дзякуючы новаўвядзенням. Так, пасля павелічэння са 120 да 150 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму «планкі даходаў» пры прызначэнні аднаразовай адраснай падтрымкі колькасць яе атрымальнікаў у параўнанні з мінулым годам узрасла амаль удвая. Прыйшлося дарэчы і рашэнне аб аказанні сацыяльнай дапамогі на набыццё тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі інвалідам III групы і дзецям, якія інвалідамі не з'яўляюцца, але пры гэтым маюць патрэбу ў гэтых сродках па заключэннях медыкаў. За паўгоддзе правам на такую сацыяльную дапамогу скарысталіся 10,3 тысячы чалавек. Нарэшце, трэба таксама нагадаць: са студзеня штомесячная адрасная сацыяльная дапамога можа аказвацца тэрмінам не на 3, а адразу на 6 месяцаў — безумоўна, гэта зноў жа паўплывала на павелічэнне папулярнасці адраснай падтрымкі.

Такім чынам, ёсць падставы для некаторых высноў: кола атрымальнікаў адраснай сацыяльнай дапамогі пашырылася, сам механізм яе прадастаўлення стаў больш простым, а ацэнка патрэбы грамадзян у падобнай падтрымцы — больш аб'ектыўнай. Прычым работа ў гэтым напрамку працягнецца і надалей.

**Сяргей ГРЫБ.**


## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БРЕСТСКИЙ РАЙАГРОСЕРВИС»

| Номер лота | ЛОТ № 1 | |
|---|---|---|
| Наименование объекта | 1. Смеситель-кормораздатчик Trioliet (инв. № 3294);<br>2. Смеситель-кормораздатчик Trioliet (инв. № 3295) | |
| Местонахождение объекта | Брестская обл., г. Брест, ул. Катин Бор, 111 В | |
| Продавец (Балансодержатель) | ОАО «Брестский райагросервис» | |
| Организатор торгов | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление | |
| Начальная цена продажи, руб. без НДС | 52 299 889 | |
| Размер задатка, руб | 5 229 989 | |
| Тип и характеристика объекта | Смесители-кормораздатчики, применяются животноводами для механизации процессов приготовления и раздачи кормовых рационов. | |
| | Тип | 1200VLS |
| | Раздача корма | поперечный транспортер спереди |
| | Объем, м³ | 12 |
| | Длина, м | 6,01 |
| | Ширина, м | 2,29 |
| | Высота, м | 2,45 |
| | Максимальная загрузка, кг | 5000 |
| | Необходимая мощность трактора, кВт/л.с. | 55/75 |
| Условия продажи | без условий | |
| Условия оплаты | оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи | |
| Срок заключения договора купли-продажи | не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов | |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл, код 153001331 УНП 102353509 | |

**Аукцион состоится 4 августа 2010 г. в 12.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329**
**РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:** г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.

**Последний день приема заявлений – 3 августа 2010 г. до 17.00.**

**Контактные тел.: 8 (0162) 23 94 25, 23 92 59, 21 88 81.**

Документы, необходимые для участия в аукционных торгах, перечислены в объявлении, опубликованном в газете № 55 от 26.03.2010 г.

## ЗАЛЕССКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (ПРОДАВЕЦ) ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже 3 (трех) земельных участков для строительства и обслуживания индивидуальных жилых домов:

**Лот 1** — земельный участок в деревне Пугачи, общая площадь 0,1609 га, кадастровый номер 622083908101000152, начальная цена 1 500 000 белорусских рублей.

**Лот 2** — земельный участок в деревне Сосновцы, общая площадь 0,1627 га, кадастровый номер 622083909101000027, начальная цена 2 000 000 белорусских рублей.

**Лот 3** — земельный участок в деревне Пугачи, общая площадь 0,2000 га, кадастровый номер 622083908101000153, начальная цена 2 000 000 белорусских рублей.

Участки размещены на расстоянии 40 километров от города Минска, 20 километров от города Заславля и 35 километров от города Молодечно, в непосредственной близости от участков имеются сети электроснабжения, водоснабжения, вблизи лес, озеро.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона.

Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечислить на расчетный счет 3600614100509 в ЦБУ № 605 г. Воложина филиала № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 601, город Воложин, улица Партизанская, 13, назначение платежа 4901, УНП 600037292, Залесский сельский исполнительный комитет.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **27 августа 2010 года** в 10.00 по адресу: деревня Новый Двор, дом 20, помещение Залесского сельисполкома.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **26 августа 2010 года** до 17.00 по адресу: деревня Новый Двор, дом 20, кабинет секретаря сельисполкома, контактный телефон **(8 01772) 32236**, сайт в интернете: **volozhin.gov.by.**


**Коллектив издательства «Харвест» приносит свои глубочайшие соболезнования родным и близким ушедшего из жизни Игоря Добролюбова — режиссера х/ф «Белые росы», «Удивительные приключения Дениса Кораблева», «Потому что люблю» и других. Он был известен не только как кинорежиссер, но и как актер, снявшийся в фильмах «Любимая» и «Девять дней одного года», а также как профессор и педагог. В 2006 году издательством «Харвест» была выпущена автобиографическая книга Игоря Добролюбова под названием «Осколки памяти».**

## Абзац

◢ Моцная спёка стала прычынай узгарання трансфарматара ў Жлобіне. З-за высокай тэмпературы, якая дасягала 33,5 градуса, у фарфоравым корпусе трансфарматара току перагрэлася трансфарматарнае масла, у выніку чаго разбурылася абалонка і загарэлася абмотка. Ратавальнікі аператыўна справіліся з агнём, перабояў з электрычнасцю не ўзнікла, паколькі спажыўцоў пераключылі на рэзервовыя лініі.

◢ **У выніку моцнага ліўня ў Гродзенскай вобласці, дзе ў некаторых раёнах выпала да 43 мм ападкаў, былі падтопленыя 3 жылыя дамы, 41 падворак у 17 населеных пунктах і пашкоджаны 5 участкаў аўтадарог. Вядуцца аднаўленчыя работы.**

◢ Жыхарка пасёлка Вострына Шчучынскага раёна да смерці збіла сына 2009 года нараджэння. Увечары 21 ліпеня ў РАУС звярнулася — маці гэтай жанчыны. Яна расказала, што ў яе дачкі невядомыя ў масках скралі хлопчыка. Аднак, як высветлілі міліцыянеры, ніхто яго выкрадаў. Маці збіла яго да страты прытомнасці і схавала ў лесе. Цяжка траўмаваны хлопчык быў знойдзены і дастаўлены ў бальніцу, дзе і памёр. У дачыненні да яго маці заведзена крымінальная справа.

◢ **32-гадовы мужчына патануў, ратуючы жонку ад лебедзя. Гэта здарылася пад Рыгай у Латвіі. Ягоная цяжарная жонка, на дзявятым месяцы чакання, падплыла заблізка да гнязда. Лебедзь атакаваў яе, бароначы сваё патомства. Муж падплыў на дапамогу. Але ў барацьбе з птушкай патануў.**

## Поўны абзац

◢ У Германіі дэпутат Марка Вандэрвітц выступіў з прапановай павялічыць кошт медыцынскай страхоўкі для людзей з залішняй вагой. На яго думку, тоўстыя людзі свядома вядуць нездаровы лад жыцця і павінны несці за гэта адказнасць і ў фінансавым плане. Эканаміст, які спецыялізуецца на сферы аховы здароўя, Юрген Вазэм падтрымаў ініцыятыву. Ён лічыць, што шкодныя для здароўя тавары павінны абкладацца больш высокімі падаткамі, як у выпадку з тытунёвымі вырабамі, а частка з іх павінна фінансаваць ахову здароўя. Згодна з вынікамі даследавання, праведзенага ўніверсітэтам Брэмена, людзі, якія церпяць ад залішняй вагі, абыходзяцца сістэме аховы здароўя ў 17 млрд еўра.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## Гэта мы, Госпадзі...

## Маці-забойцы вынеслі прысуд

**Нагадаем, што летам мінулага года 36-гадовая жыхарка вёскі Наваселле Мінскага раёна наўмысна забіла сваю двухгадовую дачку. Жанчына нанесла дзіцяці не менш як 100 удараў у жыццёва важныя органы. Біла галавой аб сцяну, край ванны. Пасля чаго пакінула дзяўчынку ў халоднай кватэры без адзення, дзе малеча і загінула.**

**Паводле слоў старшага памочніка пракурора Мінскай вобласці Таццяны КАЛІНІНАЙ**, здзекі з дзяўчынкі цягнуліся на працягу трох месяцаў перад забойствам. Асуджаная неаднаразова біла дачку рукамі, рэменем і іншымі прадметамі, выводзіла яе на балкон і пакідала распранутай на холадзе на працяглы час. Перыядычна збіваў дзяўчынку і яе сужыцель.

Мінскі абласны суд прыгаварыў маці-забойцу да 21 года пазбаўлення волі, яе сужыцеля — да двух гадоў пазбаўлення волі.

**Надзея ДРЫЛА.**


Минский городской центр недвижимости

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 23 августа 2010 года проводит открытый аукцион по продаже зданий, сооружений и иного имущества, находящегося в собственности ОАО «Белпромтара» (продавец)

### На аукционные торги выставляются:

| Номер лота | № 1 | № 2 | № 3 | № 4 | № 5 | № 6 | № 7 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота | - здание конторы, инв. номер 630/С-42877, площадь – 278,8 кв.м;<br>- здание котельной с сушилкой, инв. номер 630/С-42872, площадь – 170,0 кв.м;<br>- здание цеха новой тары, инв. номер 630/С-42874, площадь – 476,4 кв.м;<br>- здание склада хранения тары, инв. номер 630/С-42875, площадь – 993,0 кв.м;<br>- здание гаража, инв. номер 630/С-42876, площадь – 318,9 кв.м;<br>- здание склада хранения тары, инв. номер 630/С-42879, площадь – 655,9 кв.м;<br>- здание лесопильного цеха, инв. номер 630/С-42855, площадь – 481,7 кв.м;<br>- здание производственного цеха тары, инв. номер 630/С-42869, площадь – 597,7 кв.м;<br>- асфальтовое покрытие, инв. номер 630/С-50723, площадь – 6199,8 кв.м;<br>- водоем пожарный, инв. номер 630/С-50720; объем – 158.4 куб. м, диаметр – 7,0 м, глубина – 3,6 м;<br>- участок водопроводной сети, инв. номер 630/С-50721, протяженность – 159,5 м;<br>- линия электропередач, инв. номер 630/С-50726, протяженность – 656 м;<br>- насаждения производственных площадей, инв. номер 051/09. | - административное здание (в том числе: уборная, ограждение, ворота металлические, ворота металлические, забор деревянный, колодец ж/б), инв. номер 443/С-1626, площадь 82,0 кв. м;<br>- склад тары № 1, инв. номер 443/С-1627, площадь – 99,6 кв. м;<br>- склад тары № 2, инв. номер 443/С-1628, площадь 98,6 кв.м;<br>- склад прочей тары, инв. номер 443/С-1629, площадь – 973,4 кв.м;<br>- навес для хранения тары, инв. номер 443/С-1630, площадь – 412,6 кв.м;<br>- насаждения производственных площадей, инв. номер 052/09. | - здание конторы (в том числе: беседка, беседка, уборная, забор, ворота, калитка), инв. номер 450/С-5923, площадь 54,1 кв. м;<br>- производственный цех, инв. номер 450/С-5926, площадь – 1220,9 кв.м;<br>- асфальтобетонное покрытие, инв. номер 450/С-20691, площадь – 1091,1 кв.м;<br>- канализационный выпуск, инв. номер 450/С-20693;<br>- водопроводный ввод, инв. номер 450/С-20694;<br>- сеть электроснабжения, инв. номер 450/С-20695,<br>- зеленые насаждения. | - здание специализированное иного назначения (здание административно-хозяйственное с пристройкой – 8 кв. м, дворовым покрытием – 3200 кв.м, забором, воротами, калиткой), инв. номер 640/С-26358, площадь – 91,0 кв. м;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад с котельной с пристройкой), инв. номер 640/С-26363, площадь – 831,0 кв. м;<br>- здание специализированное иного назначения (цех ремонта возвратной тары со складом и навесом), инв. номер 640/С-26356, площадь – 233 кв. м;<br>- здание специализированное иного назначения (цех новой тары с механической мастерской и пристройкой), инв. номер 640/С-26361, площадь – 708,0 кв. м;<br>- сооружение специализированное энергетики (кабельная линия электропередач), инв. номер 640/С-50116;<br>- сооружение специализированное коммунального хозяйства (водопровод), инв. номер 640/С-50117;<br>- зеленые насаждения производственной территории, инв. номер 070/09. | - здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения (склад стройматериалов), инв. номер 110/С-87280, площадь – 493,6 кв. м;<br>- зеленые насаждения. | - административное здание №1, инв. номер 110/С-87263, площадь 105,9 кв. м;<br>- зеленые насаждения. | - здание склада № 1 (склад под возвратную тару), инв. номер 110/С-87287, площадь 445,5 кв. м. |
| Местонахождение имущества | Минская область, г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, д. 54 | Гродненская область, г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, д. 7 | Гродненская область, г. Слоним, ул. Железнодорожная, д. 3 | Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, пер. Пролетарский 2-й, д. 12 | Брестская область, г. Барановичи, пер. Водопроводный 2-й, д. 25 | Брестская область, г. Барановичи, пер. Водопроводный 2-й, д. 25 | Брестская область, г. Барановичи, пер. Водопроводный 2-й, д. 25 |
| Сведения о земельном участке | площадь – 2,6213 га, кадастровый номер 642000000003001231; площадь – 0,1816 га, кадастровый номер 642000000003001230, назначение – содержание и обслуживание зданий и сооружений | площадь – 0,9336 га, кадастровый номер 425650100001000935, назначение – размещение производственной базы | площадь – 0,5614 га, кадастровый номер 425450100001001503, назначение – обслуживание зданий и сооружений | площадь – 1,0180 га, кадастровый номер 624650100001005929, назначение – содержание и обслуживание зданий и сооружений | площадь – 0,1911 га, кадастровый номер 141000000007003197, назначение – обслуживание склада стройматериалов | площадь – 0,0303 га, кадастровый номер 141000000007003196, назначение – обслуживание административного здания № 1 | площадь – 0,2274 га, кадастровый номер 141000000007003198, назначение – обслуживание склада № 1 |
| Начальная цена с учетом НДС | 875 038 800 белорусских рублей | 217 383 600 белорусских рублей | 220 362 120 белорусских рублей | 378 244 200 белорусских рублей | 206 952 000 белорусских рублей | 96 120 000 белорусских рублей | 265 920 000 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 85 000 000 белорусских рублей | 20 000 000 белорусских рублей | 20 000 000 белорусских рублей | 37 000 000 белорусских рублей | 20 000 000 белорусских рублей | 9 000 000 белорусских рублей | 26 000 000 белорусских рублей |
| Обременение договорами аренды: номер, дата (срок действия) | | | Договор № 40 от 12.02.2010 г. по 11.02.2013 г. (произ. цех – 58,8 м²) | | | | |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Заявитель, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект (лот). Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона заключается в течение 20 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта (лота) осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа. Аукцион состоится **23 августа 2010 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с **26.07.2010 по 20.08.2010** включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;**
**(017) 294 67 13, (029) 636 15 22 – ОАО «Белпромтара».**
**Интернет: www.mgcn.by**

Кватэрнае пытанне

## КАЛІ ДОМ НЕ ПОМНІК...

**НАША сям'я займае службовую кватэру, збіраемся зрабіць рамонт. Калі ласка, напішыце, на якія з відаў работ патрэбен праект і дазвол выканкама, а на якія не?**

**С. Тарасенка**, *Мазырскі раён.*

Згодна з Тыпавым дагаворам найму службовага жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 7 сакавіка 2006 г. № 371), наймальнік службовага жылога памяшкання мае права за кошт уласных сродкаў самастойна або з прыцягненнем жыллёва-эксплуатацыйнай або іншай арганізацыі, якая вядзе эксплуатацыю дома, ажыццяўляць рамонт кватэры, замену і рамонт зношанага і выйшаўшага са строю ўнутрыкватэрнага санітарна-тэхнічнага, газавага, электрычнага і іншага абсталявання. Пры гэтым не допускаецца выканання ў службовым жылым памяшканні работ або ажыццяўлення іншых дзеянняў, што прыводзяць да яго псавання.

Што датычыцца пераўладкавання жылога памяшкання, то гэта пытанне рэгламентаванае Палажэннем аб парадку пераўладкавання і перапланіроўкі жылых памяшканняў у шматкватэрных жылых дамах (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2006 г. № 1805).

У прыватнасці, не патрабуюцца дазвол мясцовага выканаўчага і распарадчага органа і распрацоўка праекта для:

установкі (замены) міжпакаёвых дзвярэй у межах існуючага дзвярнога праёма;

майстравання падвесных (нацяжных) століяў, стацыянарных шафаў і антрэсоляў;

установкі вентыляцыйных прыбораў;

замены электратэхнічных вырабаў (разетак, выключальнікаў, свяцільнікаў) і пакрыццяў на падлозе на тыя, якія маюць аналагічныя тэхнічныя характарыстыкі;

замены электрычных пліт і санітарна-тэхнічнага абсталявання.

Па ўзгадненні з арганізацыяй, якая вядзе эксплуатацыю жыллёвага фонду, арганізацыяй грамадзян-забудоўшчыкаў, спецыялізаванымі арганізацыямі (органамі), што абслугоўваюць жылы дом, могуць ажыццяўляцца:

установка індывідуальных прыбораў уліку вады (узгадненне з арганізацыяй, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду, арганізацыяй грамадзян-забудоўшчыкаў);

замена аконных і балконных запаўненняў фасадаў жылых дамоў, а таксама ўпарадкаванне памяшканняў, якія не ацяпляюцца, за кошт шклення балконаў і лоджыяў (узгадненне з мясцовым тэрытарыяльным органам архітэктуры і горадабудаўніцтва);

установка ўзмоцненых і дадатковых уваходных дзвярэй у памяшканне (узгадненне з арганізацыяй, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду, арганізацыяй грамадзян-забудоўшчыкаў);

замена газавых пліт, установка індывідуальнага прыбора ўліку газу (узгадненне з абслуговай арганізацыяй газавай гаспадаркі).

Для ажыццяўлення пералічаных работ таксама не патрабуюцца дазвол мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, распрацоўка праекта і яго дзяржаўная экспертыза.

Неабходна таксама звярнуць увагу на тое, што замена аконных і балконных запаўненняў, а таксама ўпарадкаванне памяшканняў, якія не ацяпляюцца, за кошт шклення балконаў і лоджыяў у жылых дамах, унесеных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляюцца па ўзгадненні з тэрытарыяльным органам архітэктуры і горадабудаўніцтва і Міністэрствам культуры ў парадку, вызначаным заканадаўствам.

**Віктар САВІЦКІ.**

# «ЗДАЕЦЦА, ШТО Я ЯШЧЭ І НЕ ЖЫЎ...»

**У ліпені Уладзіміру Емяльянавічу Бычкоўскаму споўніўся 101 год. Ганаровы жыхар Ельска шчыра ўсміхаецца, калі ўзгадвае сваё жыццё — чаго толькі ні было ў ім!**



— Хоць здаецца, што я яшчэ і не жыў!..

***— Што, і падзеі 17 года мінулага стагоддзя памятаеце?***

— А як жа! Мой бацька ў царскай арміі служыў. Калі вярнуўся, расказваў, як рэвалюцыю рабілі. Як пагоны рвалі з афіцэраў. Далі сялянам тады зямлю — а зямля вырашала ўсё. Ёсць яна — чалавек жыве, няма — няма і жыцця. Ніякай каштоўнасці, акрамя яе, і не было — пра тэхніку нават не марылі.

***— За межы ваявалі?***

— Гэта было. Сусед запахаў баразну — значыць, спрэчка. Да бойкі даходзіла — усяк было. Калі калгас арганізоўвалі, мне было 20 гадоў. Бацька быў членам сельсавета. Лічы — гаспадаром у вёсцы. Калі хто прыязджаў з раёна, ён дапамагаў. Калі збіралі падаткі, развозіў прадстаўнікоў улады з раёна па хутарах. Я сам у Мазыр вазіў збожжа падводамі, калі праводзілі харчразвёрстку. Галодныя ж усе былі. У гарадах людзі мёрлі тады, а ў вёсцы можна было яшчэ неяк жыць. У Аляксандраўцы, дзе я пражыў усё жыццё, у той час было 10 двароў, 65 душ.

Атрымліваецца, што ў кожнай сям'і — не менш за 6 чалавек, а ў некаторых — і больш. Для таго часу — зусім не дзіўна, бо і Уладзімір Емяльянавіч быў шостым, апошнім дзіцем у сваёй сям'і. Яго, між іншым, у сямігадовым узросце аддалі выхоўвацца ў сям'ю роднай сястры маці — яго бяздзетнай цёткі:

— З ахвотай я туды пайшоў — там было лепш, бо я ж адзін у іх быў. Яны мяне афіцыйна ўсынавілі. Калі б інакш, лічылася, што батрак. А калі батрака эксплуатуеш, значыць — кулак. Была б прычэпка, каб іх выслаць. На працягу двух гадоў па ўсёй Беларусі стварылі калгасы. З Украіны прыслалі рабочых для арганізацыі калгасаў. І яны, чужыя людзі, тут дзейнічалі: што скажуць, тое і будзе. Упаўнаважанага вельмі баяліся. Барануем, ён прыйшоў, глянуў: чаму зерне наверсе, кажа? І ўсё, ты — вораг народа. Назаўтра чалавека няма, будзе на Салаўках.

Уладзімір Емяльянавіч памятае, як цяжка арганізоўваліся на Палессі калектыўныя гаспадаркі. Як людзі не хацелі прымаць новыя парадкі. Толькі пад страхам смерці згаджаліся прыняць умовы новых уладаў, якія людзей зусім не шкадавалі.

— Не хацелі людзі ісці ў калгас. Гэта ж трэба сваё аддаць: вала, каня, барану, насенне, пабудовы... Зямлі пакідалі толькі 45 сотак, астатняе станавілася агульным. Народу вусцішна было. Да бацькі многія прыходзілі раіцца — што рабіць? Ён адказваў — гэта непазбежна, трэба ісці. Спачатку толькі з дзясятка двароў сваё дабро ў калгас людзі прывезлі. Астатнія чакалі, што будзе далей. А тых, у каго крыху больш чаго было, — кулакоў — адразу ж саслалі на Салаўкі. Вось тады стала страшна астатнім. Калі адных выслалі, астатнія ў калгас пайшлі. А беднякі не хацелі ісці да апошняга. Яны працаваць не ўмелі і не хацелі. Гультаі. З яго што возьмеш — нічога! Ён ведае, што і абарона за ім ёсць — улада, таму і не ішлі. Блыталіся да апошняга. А тых, хто працаваў, хто меў кавалак хлеба, іх узялі ды выслалі.

***— Атрымліваецца, тады і адбілі ахвоту займацца зямлёй?***

— Калі абвясцілі НЭП у 20-х гадах, некаторыя сталі весці свае асобныя ўзорныя гаспадаркі. Потым іх назвалі заможнымі і многіх выслалі. У нашай вёсцы тры такія працавітыя сям'і было. Ніхто назад не вярнуўся.

Ваенная служба для Уладзіміра Емяльянавіча Бычкоўскага пачалася ў 35-м годзе, калі яго ў армію прызвалі. Адслужыў два гады, вярнуўся ў родную вёску. Адукацыя ў яго — толькі 5 класаў, але ж у многіх аднагодкаў і іх не было. Таму ён лічыўся пісьменным. Умеў жа чытаць, пісаць і лічыць — і добра. Паспеў толькі ажаніцца і нядоўга пабыць у якасці старшыні калгаса — і зноў Радзіма заклікала ўзяць зброю ў рукі:

— У 1939 годзе пачалася вайна, і пайшоў я на Польшчу ваяваць. Служыў у цяжкай артылерыі, радавым быў. Ішлі і ішлі, ледзь да Варшавы не дайшлі. Спынілі нас у Бяла-Падлясцы — хлопцы, далей не ідзіце, кажуць. Ніякага супраціўлення мы не сустракалі. Заходнюю Беларусь вызвалілі амаль што без стратаў. Аднойчы нас з царквы абстралаяў кулямётчык і тады нам далі загад знішчыць тую царкву прамой наводкай. А потым наш полк кінулі на Фінляндыю. Мяне тады пакінулі на тэрыторыі Польшчы, дзе былі артылерыйскія склады.

Калі пачалася Вялікая Айчынная, Уладзімір Бычкоўскі быў ужо бывалым салдатам і толькі-толькі вярнуўся з войскаў дадому. Яго з аднавяскоўцамі на фронт адпраўлялі з Мазыра, а Бабруйск у той час ужо быў заняты немцамі.

— Атрымлівалася, што мы ішлі адразу ў палон. Так і здарылася з тымі, хто паспеў перайсці мост цераз Днепр. Увесь народ загінуў. Вярнуліся толькі тыя, хто змог уцекчы. Мне пашанцавала. Я ехаў на падводзе ззаду. Ад самалётаў раптам цёмна стала, быццам хмара. Немцы разбілі драўляны мост цераз Днепр. Мяне раніла ў галаву, калі мы адступалі. Думаў, што вока выбіла. Кроў папёрла, мне закруцілі галаву ручніком і так ішоў. Але зачапіла неглыбока. Тыя, хто застаўся на гэтым беразе Дняпра, сталі вяртацца — а праз Прыпяць таксама сарваны мост і перайсці нельга, каб трапіць дадому. Мы знайшлі чалавека, які нас перавёз цераз раку. А вакол жа немцы, усё акупіравана. Куды ісці? Толькі ў партызаны. Так я і трапіў у атрад «Смерць фашыстам». А жонка ў вёсцы заставалася з двума маленькімі сынамі — Васілём і Мікалаем. Ноччу я да яе прыходзіў. Жонка гатавала штонебудзь паесці. Мы ж галодныя былі. Партызанскі атрад трымаўся на жонках. У сваю вёску мы хадзілі пастаянна.

Ветэран сціпла ўзгадвае гады вайны, сваю 37-ю партызанскую брыгаду. Між тым, менавіта за «рэйкавую вайну» ён атрымаў медаль «За адвагу».

— Гэта калі мост узарвалі цераз рэчку Славечна. Звычайна мы падкладвалі міну і ўзрывалі рэйкі, масты. З толу рабілі выбуховыя прыстасаванні — любую рэйку так закруціць! Ноччу ўсё рабілася. Немцы нас абстрэльвалі, яны масты ахоўвалі, а мы усё роўна іх абыходзілі. Было, рабілі немцы абл аву на партызан. Забралі ўсе нашы боепрыпасы — мы без зброі і без харчу засталіся. Але ж сувязь з вялікай зямлёй была. Потым да нас ноччу самалёт-кукурузнік прылятаў у вёску Дубнае Лельчыцкага раёна і нам боепрыпасы прывозілі. Але ж у асноўным, трафейным ваявалі: што адаб'ём — тое наша. Мы ж у лапцях ваявалі — гэта толькі ў кіно паказваюць партызан у ботах. Я лапці плёў. Хто не ўмеў іх абуваць — вучыў. Ганялі нас добра немцы. І мы, калі адчувалі, што немцы нас шукаюць, рухаліся амаль пастаянна. Летам у куранях жылі, зімой зямлянкі рылі.

Ельск вызвалілі ў самым пачатку 1944 года. Тады адпала неабходнасць і ў партызанах. Частку з іх накіравалі на фронт, а Уладзіміра Бычкоўскага з іншымі — аднаўляць разбураную гаспадарку раёна. І зноў заклікалі яго калгас узнімаць. У партызанах не быў паранены, а вось тут бяда бокам не абышла. Тыф пачаў касіць людзей, расказвае Уладзімір Емяльянавіч:

— Усе павалам ляжалі. Фельдчар мне кажа: «Бычкоўскі, спачатку трэба людзей выратоўваць, а потым калгас утвараць. Мы некалькі дзён збіралі хворых, звозілі іх у кантору, дзе бальніцу арганізавалі. Ложкі ў людзей бралі. Праз дзён пяць захварэў і я. Мая сям'я тады жыла ў зямлянцы, бо немцы ж хату спалілі. Мяне без памяці прывезлі да сваякоў якраз тады, калі памёр мой бацька. Ну а пакуль я выкараскваўся, новага чалавека паставілі ўзначальваць калгас. Пасля вайны выбіраць не даводзілася: куды пашлюць, туды я і шоў працаваць. Быў час, займаўся арганізацыяй Мелешкаўскага лясніцтва. А калі прыйшоў ляснічы з дыпломам, перадаў яму пасаду і пайшоў у калгас. Бабамі камандаваў. Бабы касілі, я ім косы кляпаў. З таго часу і быў усё жыццё брыгадзірам у комплекснай брыгадзе.

А яшчэ яны з жонкай дзяцей падымалі. Адразу пасля вайны ў сям'і Бычкоўкіх яшчэ дзве дзяўчынкі нарадзіліся: Алена і Таццяна. Як ні цяжка было, а ў людзі ўсіх вывелі, вывучылі. Сёння самі ўнукаў гадуюць — дзедавых праўнукаў. Праўда, шкадуе, што ў яго ўсяго толькі сем унукаў і шэсць праўнукаў. А пра сакрэты доўгажыхарства — тут усё проста:

— Лад жыцця — самае галоўнае. Без працы я столькі не пражыў бы. Колькі памятаю, столькі працаваў. Не п'янстваваў ніколі. Не паліў ніколі — нават у партызанах. Хоць некаторыя палілі дубовае лісце з мохам. І захапленне ў мяне было — пчалярства. Пакуль быў малады, дык збіраў у калодах мёд. Але ж цяпер ужо не магу па дрэвах лазіць.

Тым не менш, тры яго вуллі ў Аляксандраўцы засталіся. Даглядаць іх возяць дзеда ўнукі. Акрамя таго, ён дапамагае куды маладзейшаму суседу асвойваць сакрэты пчалярства. Зусім нядаўна, пасля смерці жонкі, з якой пражылі душа ў душу, Уладзімір Емяльянавіч пераехаў у Ельск да малодшай дачкі Таццяны, але ж на яе харчах дарма не сядзіць. Калі трэба — бярэ касу і траву абкошвае ці іншае што па гаспадарцы робіць. Яшчэ адзін рэцэпт маладосці ад Уладзіміра Бычкоўскага: раніцай, перад ежай — лыжка прапалісу, настоенага на спірце. Падкрэслівае: толькі лыжка, не больш. І яшчэ ён не ўжывае цукру — толькі мёд, чаго і ўсім раіць. Каб жылі доўга і не хварэлі. На развітанне Уладзімір Емяльянавіч са мной сфатаграфаваўся. Абняў моцна, падміргнуў і кажа:

— Глядзі, мужык раўнаваць будзе!

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

*Ельскі раён.*

# З НАМІ Ў МАМІН СВЕТ!



**Фітнэс для цяжарных, трэнінгі і лекцыі для будучых бацькоў, падрыхтоўка пар да партнёрскіх родаў — усяму гэтаму можна навучыцца ў сямейным цэнтры «Калыска», які працуе з беларускімі мамамі і татамі каля пятнаццаці гадоў. Менавіта дзякуючы цэнтру матулі не губляюць ад страху галавы, самі спрабуюць кіраваць працэсам з'яўлення дзіцяці на свет, і, выходзячы з радзільнага дома, не заракаюцца патрапіць сюды зноў. А яшчэ дзякуючы спецыяльнай методыцы трымаюць сябе ў добрай фізічнай форме як падчас цяжарнасці, так і пасля родаў!**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ПАТАНУЛІ БАЦЬКІ...

**У Барысаве па дапамогу да супрацоўнікаў міліцыі звярнуўся вучань дзясятага класа з вёскі Кішчына Слабада, які паведаміў пра тое, што зніклі яго бацька і маці.**

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, юнак распавёў, што яго 38-гадовыя бацькі пайшлі ў аўторак апоўдні на возера і не вярнуліся дадому. На жаль, як высветлілася, абое патанулі: мужчына ў той дзень, пасля таго як выпілі спіртнога, пайшоў купацца ў возера, а праз гадзіну да вады накіравалася і жанчына, каб адшукаць, куды ён знік... Целы абедзвюх ахвяраў без бачных прыкмет гвалтоўнай смерці былі выцягнутыя з вады. Цяпер праверкай гэтага здарэння займаецца пракуратура Барысаўскага раёна.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ПРЫВАТЫЗАВАЎ ДЗЯРЖАЎНУЮ МЯЖУ

Па інфармацыі прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі, падчас апаратыўных мерапрыемстваў супрацоўнікі ўпраўлення ўласнай бяспекі ноччу 18 ліпеня затрымалі ваеннаслужачага Пінскага пагранатрада, які выкарыстоўваў падробленыя штампы і ставіў дата-штампы ў непрацоўны час у дакументы ахвотным перайсці дзяржаўную мяжу Беларусі.

Заведзена крымінальная справа.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Дызпаліва са «скідкай»

## А ГРОШЫ — У КІШЭНЮ

Такім чынам папраўлялі сваё матэрыяльнае становішча два прадпрымальныя кіроўцы транспартных прадпрыемстваў, якія з устаноўленай цаны ў 2580 рублёў за літр дызпаліва рабілі зніжку ў 600—700 рублёў. Прычым, паводле звестак прэс-афіцэра Заводскага РУУС Тамары Рулінскай, прадавалі «бізнэсмены» іншым кіроўцам паліва, аплачанае іх прадпрыемствамі.

Так, спачатку быў затрыманы 43-гадовы жыхар Смалявіцкага раёна, які працаваў кіроўцам на адным са сталічных прадпрыемстваў, што спецыялізуецца на перавозках у Расію і краіны Садружнасці. На адной са станцый па Партызанскім праспекце ён прапаноўваў дызпаліва кіроўцам вялікагрузных аўто па прывабнай цане і, зразумела, не застаўся без кліентуры. Ужо высветлена, што зламыснік тры разы выкарыстоўваў заправачна-магнітную карту, забяспечваючы палівам, якое аплаціла яго прадпрыемства, ахвотнікаў. А выручаныя такім чынам грошы браў сабе: ён прысвоіў каля 2100 літраў дызпаліва на суму каля 5 мільёнаў рублёў.

Другі хітрун, 39-гадовы кіроўца іншага транспартнага прадпрыемства, незаконна выкарыстаў замацаваную за ім картку на аўтазапраўцы па вуліцы Кабушкіна. Як мяркуецца, ён паспеў «нагандляваць» дызпалівам на суму больш за 2 мільёны 800 рублёў. У дачыненні да абодвух кіроўцаў заведзеныя крымінальныя справы, і ім пагражае пакаранне аж да пазбаўлення волі на тэрмін да трох гадоў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

У **суд Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Калугіна Юрыя Міхайлавіча**, 1962 года нараджэння, ураджэнца г. Белгарад Расійскай Федэрацыі, апошняе вядомае месца жыхарства якога — Гродзенская вобласць, Ваўкавыскі раён, в. Студзянец, вул. Радніковая, 74, які ў красавіку 2007 г. выбыў у невядомым накірунку і да цяперашняга часу яго месца знаходжання невядомае.

Просім грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Калугіна Юрыя Міхайлавіча, паведаміць суду Ваўкавыскага раёна на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

Падрабязнасці

## ЗНАЙШЛІ НА ЧАЦВЁРТЫЯ СУТКІ

**На пошукі 12-гадовага хлопчыка з сіндромам Даўна, які згубіўся ў Петрыкаўскім раёне, было выведзена каля 100 чалавек: міліцыя, выратавальнікі, леснікі, грамадскасць.**

Як расказаў **начальнік аддзела вышуку Петрыкаўскага РАУС Алег ЯРМОЛІЧ**, «адпрацоўвалі» кожны квартал лесу, агледзелі тэрыторыю каля населеных пунктаў Капцэвічы, Брынёў і Славінск. Наткнуўся ж на дзіця родны бацька. Хлопчык зрабіў сабе подсціл і жыў на балоце чатыры дні, пакуль яго шукалі. Стан дзіцяці пасля агляду ўрача прызнаны здавальняючым.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ПРУП «Брестский электротехнический завод» Белорусской железной дороги

| Номер лота | ЛОТ № 1 | |
|---|---|---|
| Наименование объекта | Одноэтажный деревянный жилой дом с пристройками | |
| Местонахождение объекта | Брестская обл., Дрогичинский р-н, д. Горавица, ул. Озерная, 11 | |
| Продавец (Балансодержатель) | ПРУП «Брестский электротехнический завод» Белорусской железной дороги | |
| Организатор торгов | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление | |
| Начальная цена продажи, руб. без НДС | 4 611 000 | |
| Размер задатка, руб. | 46 110 | |
| Право на земельный участок | 0,2303 | после продажи объекта с аукционных торгов границы земельного участка будут уточняться путем выполнения комплекса топогеодезических работ |
| Тип и характеристика объекта | Общая площадь по СНиП 100,4 $м^2$, общая жилая площадь – 73,2 $м^2$, площадь жилых помещений – 60,1 $м^2$. Год постройки – 1964. Фундамент бетонный; стены брус обшит; перекрытия деревянные, перегородки деревянные, крыша шифер, полы дощатые, проемы простые с простыми приборами, печное отопление, газоснабжение, электроосвещение, радио, телевидение. К жилому дому (литер А1/д) примыкает веранда (литер 1), хол. пристройка (литер 2), веранда (литер 3). На земельном участке имеются следующие хозяйственные постройки: летняя кухня, пл. 14 $м^2$; погреб, пл. 7 $м^2$; сарай, пл. 47 $м^2$; сарай, пл. 14 $м^2$; уборная; колодец | |
| Условия продажи | без условий | |
| Условия оплаты | оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи | |
| Срок заключения договора купли-продажи | не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов | |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012035310012 рубли РБ в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 331, УНН 102353509 | |

**Аукцион состоится 31 августа 2010 г. в 12.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329**
**РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление**

**Для участия в аукционе необходимо предоставить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

* Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20 % от продажной цены объекта.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:**
г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.
**Последний день приема заявлений – 30 августа 2010 г. до 17.00.**
**Контактные тел.: 8 (0162) 23 94 25, 23 92 59, 21 88 81.**

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «МАЛОРИТСКИЙ КОНСЕРВНО-ОВОЩЕСУШИЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»

| Номер лота | ЛОТ № 1 | |
|---|---|---|
| Наименование объекта | **Незавершенный строительством законсервированный цех плодоовощных консервов для детского питания (инв. № 103/U-9173), общ. пл. 5047 $м^2$, степень готовности 64 %. Год начала строительства 1994.** | |
| Местонахождение объекта | Брестская обл., г. Малорита, ул. Заводская, д. 9А | |
| Продавец (Балансодержатель) | ОАО «Малоритский консервно-овощесушильный комбинат» | |
| Организатор торгов | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление | |
| Начальная цена продажи, руб. без НДС | 5 085 604 215 | |
| Размер задатка, руб | 50 856 042 | |
| Право на земельный участок | 1,0702 га | после продажи объекта с аукционных торгов границы земельного участка будут уточняться путем выполнения комплекса топогеодезических работ |
| Тип и характеристика объекта | Фундамент сб. ж/бетонный (100 % степ. готовности); стены и перегородки – ж/б панели, кирпич (100 % степ. готовности); перекрытия – ж/б плиты (100 % степ. готовности); кровля рулонная (100 % степ. готовности); полы бетонные, проемы деревянные, металлические (50 % степ. готовности) отделочные работы, внутренние сантех. и электротехн. устройства – отсутствуют | |
| Условия продажи | без условий | |
| Условия оплаты | оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи | |
| Срок заключения договора купли-продажи | не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов | |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012035310012 рубли РБ в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 331 УНН 102353509 | |

**Аукцион состоится 26 августа 2010 г. в 10.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329**
**РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление**

**Для участия в аукционе необходимо предоставить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

* Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20 % от продажной цены объекта, стоимость комиссионного вознаграждения организатору аукциона в размере 0,5 % от продажной цены объекта.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:**
г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.
**Последний день приема заявлений – 25 августа 2010 г. до 17.00.**
**Контактные тел.: 8 (0162) 23 94 25, 23 92 59, 21 88 81.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА И ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ ОБСЛУЖИВАНИЯ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

| Наименование предмета аукциона | Два капитальных строения и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | г. Брест, ул. Строительная, д. 56 |
| Продавец недвижимого имущества | Министерство промышленности Республики Беларусь (в лице ОАО «БЭМЗ») тел. 8 (0162) 42 25 64 |
| Сведения о предмете аукциона | Капитальное строение (Здание мазутонасосной станции), общая площадь 232,8 кв.м (1 эт. 1990 г.п., стены – кирпич, ж/б панели), с очистными сооружениями и двумя резервуарами для мазута. Капитальное строение (Здание котельной), общая площадь 582,5 кв.м (1 эт. 1990 г.п., стены – кирпич, ж/б панели) с дымовой трубой, забором, асфальтобетонным покрытием, кабельными сетями, сетями связи, сигнализацией, сетями водопровода, сетями дождевой канализации, тепловыми сетями. Земельный участок площадью 0,9717 га, срок аренды – 5 лет. Использовать для реконструкции объекта в соответствии с проектом детальной планировки г. Бреста. |
| Начальная цена единого предмета аукциона, руб. | 713 986 913 |
| Сумма задатка, руб. | 71 398 600 |

***Организатор аукциона Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11, тел. (0162) 23 44 06, 21 19 82, 20 87 85, 23 44 78 www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by***

**Аукцион состоится 25 августа 2010 года в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524.**

**Для участия в аукционе представляются***:*

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».
2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – 24.08.10 г. включительно;
3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.
4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.
5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.
6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

***Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 24 августа 2010 года включительно.***

